РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

А. У. ГАРАВЫЙ

## ІНВЕСТЫЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЛЬВОЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў АГУЛЬНАЎКРАІНСКІМ КАНТЭКСЦЕ

*Львоўскі нацыянальны ўніверсітэт ім. Івана Франко, г. Львоў, Украіна*
*oleggorovyi@ukr.net*

Ва ўмовах трансфармацыі гаспадарчага комплексу краіны інвестыцыі лічацца сінонімам яе эканамічнага развіцця. Прыцягненне інвестыцый у рэгіёны краіны спрыяе рэалізацыі новых праэктаў, дазваляе атрымліваць і выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі і абсталяванне, асвойваць новыя рынкі збыту.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Украіны пачаўся працэс фарміравання яе інвестыцыйнага рынку. Адметнай рысай інвестыцыйнай дзейнасці Украіны з'яўляецца яе цесная сувязь з эканамічнай сітуацыяй у краіне. Таму праблемы эканамічнага развіцця абумоўліваюць і праблемы ў фарміраванні інвестыцыйнага асяроддзя. Калі ў 1991–1997 гг. аб'ёмы інвестыцый скарачаліся, то з 1998 назіраецца паступовае павышэнне інвестыцыйнай актыўнасці [3, с. 55]. Наступствам гэтых працэсаў стала тэрытарыяльная дыферэнцыяцыя інвестыцыйных патокаў на карысць індустрыяльных рэгіёнаў Украіны – Данбаса, Прыдняпроўя, Кіева, а таксама Кіеўскай і Львоўскай абласцей.




**Малюнак 1 – Групоўка рэгіёнаў Украіны па паказчыках інвестыцыйнай дзейнасці (пабудаваны з дапамогай метаду «дрэва спалучэнняў»)**

Львоўская вобласць – старапрамысловы рэгіён у заходняй частцы Украіны з унутранымі адрозненнямі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Інвестыцыйную прывабнасць тэрыторыі вобласці, г. зн. яе здольнасць прыцягваць капіталаўкладанні з іншых месцаў, у тым ліку замежных [4, с. 167], фарміруюць шэраг фактараў – выгаднае геаграфічнае становішча, спрыяльныя прыродныя ўмовы і наяўнасць разнастайных прыродных рэсурсаў, танная рабочая сіла. Значны ўплыў інвестыцыйнай дзейнасці на гаспадарку Львоўшчыны абумоўлены непасрэдным суседствам з Еўрапейскім Саюзам.

Галоўнымі кампанентамі, якія фарміруюць інвестыцыйную дзейнасць, з'яўляюцца прамыя замежныя і капітальныя інвестыцыі. Па стане на 1 студзеня 2014 г. у гаспадарку Украіны прыцягнута амаль 5,8 млрд. дол. ЗША прамых замежных інвестыцый (ПЗІ). Доля Львоўскай вобласці ў агульнаўкраінскім паказчыку склала 2,9 % (доля насельніцтва складае 5,5 %). Паказчыкі інвестыцыйнай дзейнасці вобласці маюць тэндэнцыю да росту.

Геаграфічнае становішча Украіны абумовіла еўрапейскую накіраванасць ПЗІ. Галоўнымі інвестарамі дзяржавы і Львоўскай вобласці ёсць партнёры з ЕС – Германія, Нідэрланды, Аўстрыя, Вялікабрытанія, Польшча. Варта адзначыць, што высокай (25–35 %) застаецца доля ПЗІ з афшорных зон – Кіпра і Брытанскіх Віргінскіх астравоў. Інвестыцыі з афшораў сведчаць аб вывадзе сродкаў з краіны ў папярэднія гады.

Хоць замежныя інвестыцыі працягваюць паступаць ва Украіну, аднак яны не спрыяюць паляпшэнню эканамічнай сітуацыі ў краіне. Прычынай гэтаму з'яўляецца тое, што інвестыцыйныя патокі накіроўваюцца ў высокапрыбытковыя галіны – банкаўска-фінансавую сферу, аперацыі з нерухомай маёмасцю, гандаль, харчовую прамысловасць. Галоўнай інвестыцыйна прывабнай галіной у агульнаўкраінскім вымярэнні з'яўляецца прамысловасць, на развіццё якой накіраваны 31 % ПЗІ, а на Львоўшчыне аналагічны паказчык складае больш за 42 %.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Табліца – Месца Львоўскай вобласці ва Украіне па асноўных паказчыках інвестыцыйнай дзейнасці ў 2013 г. (пабудавана на аснове дадзеных [1, 2])**

| Паказчыкі | Львоўская вобласць; месца | Украіна | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Увогуле | Максімальнае значэнне; рэгіён | Мінімальнае значэнне; рэгіён |
| Прамыя замежныя інвестыцыі на 1 студзеня 2014 г., *млн.дол. ЗША* | 1706,0; шостае | 58156,9 | 28039,7; г. Кіеў | 68,2; Цярнопальская вобл. |
| Аб'ёмы прамых замежных інвестыцый на аднаго чалавека на 1 студзеня 2014 г., *дол. ЗША* | 676,7; дзясятае | 1283,6 | 9958,7; г. Кіеў | 63,6; Цярнопальская вобл. |
| Тэмпы росту (зніжэння) аб'ёмаў прамых замежных інвестыцый па рэгіёнах Украіны, *у адсотках да папярэдняга года* | 104,2; дваццаць другое | 105,2 | 145,4; Кіраваградская вобл. | 89,2; Валынская вобл. |
| Прамыя інвестыцыі з рэгіёнаў Украіны ў эканоміцы краін свету на 1 студзеня 2014 г., *млн. дол. ЗША* | 28,4; шостае | 6575,3 | 5432,2; Данецкая вобл. | 0,1; Херсонская вобл., Кіраваградская вобл. |
| Аб'ёмы капітальных інвестыцый, *млн. грн.* | 9817; восьмае | 267728 | 70321; г. Кіеў | 2125; Херсонская вобл. |
| Індэксы капітальных інвестыцый да папярэдняга года,% | 81,4; дваццаць першае | 88,9 | 142,6; Луганская вобл. | 59,6; Харкаўская вобл. |
| Капітальныя інвестыцыі на аднаго чалавека, *грн.* | 3893,7; адзінаццатае | 5908,9 | 24975,3; г. Кіеў | 1978,4; Херсонская вобл. |
| Капітальныя інвестыцыі ў будаўніцтва, *млн. грн.* | 2262; чацвёртае | 41567 | 9447; г. Кіеў | 298; Кіраваградская вобл. |

Гісторыка-геаграфічныя асаблівасці развіцця гаспадаркі абумовілі тэрытарыяльныя дыспрапорцыі ў размяшчэнні інвестыцый. Горад Кіеў – не толькі сталіца Украіны, але і яе галоўны інвестыцыйны цэнтр. Па многіх паказчыках, якія тычацца інвестыцыйнай дзейнасці (табліца), Кіеў утрымлівае першыя пазіцыі. У Львове канцэнтруецца 65 % прамых замежных і 56 % капітальных інвестыцый вобласці.

Акрамя таго, на Львоўшчыне галоўныя інвестыцыйныя патокі накіраваны ў эканамічна развітыя раёны – Бускі, Стрыйскі, Каменка-Бугскі, Яваравскі, Жыдачаўскі, Пустомытаўскі, а таксама тыя, дзе ёсць магчымасць развіваць турыстычна-рэкрэацыйную сферу – Сколеўскі раён і гарады Трускавец і Моршын. Мізэрныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

інвестыцыйныя ўліванні накіраваныя ў аграрныя раёны – Бродаўскі, Самбарскі, Старасамбарскі (малюнак 2).

Адным з кірункаў прыцягнення інвестыцый у эканоміку Украіны з'яўляецца стварэнне спецыяльных эканамічных зон (СЭЗ), асноўнай мэтай якіх з'яўляецца развіццё бізнесу пераважна на дэпрэсіўных тэрыторыях. Сёння на тэрыторыі Украіны зарэгістравана 11 СЭЗ, аднак фактычна працуе толькі шэсць – «Данецк», «Закарпацце», «Славуціч», «Явараў», «Порта-Франка», «Рэні». На тэрыторыі Львоўшчыны на працягу 2000–2013 гг. функцыянавала дзве СЭЗ – турыстычна-рэкрэацыйная «Курортаполіс Трускавец» і прамысловая «Явараў». У 2013 г. у СЭЗ «Явараў» рэалізавалася 59 праектаў (першы паказчык ва Украіне), у яе развіццё было накіравана 41 млн. грн ПЗІ. З 2010 г. спынілася паступленне інвестыцый у СЭЗ «Курортаполіс Трускавец» праз змены ў заканадаўстве і фактычную рэалізацыю ўсіх інвестыцыйных праектаў.




**Малюнак 2 – Інвестыцыйная дзейнасць Львоўскай вобласці (пабудавана на аснове дадзеных [1, 2])**

Такім чынам, інвестыцыйны рынак Украіны знаходзіцца на стадыі станаўлення. Львоўская вобласць пазіцыянуе сябе як рэгіён са спрыяльным інвестыцыйным асяроддзем праз блізкасць да ЕС. Аднак для ўстойлівага развіцця Львоўшчыны і прыпынення стагнацыі асобных яе раёнаў неабходна вызначыць прыярытэтныя напрамкі актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці.

РОЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс літаратуры

1 Галоўнае упраўленнестатыстыкіў Львоўскай вобласці [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.lv.ukrstat.gov.ua/

2 Дзяржаўная служба статыстыкі Украіны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.ukrstat.gov.ua/

3 Україна. Промисловість та інвестиційна діяльність: Атлас. – К. : ДНВП «Картографія», 2003. – 80 с.

4 Шаблій, О. І. Основи загальної суспільної географії / О. І. Шаблій. – Львів. : Видавничий центр ЛНУ ім. Івана Франка. – 2003. – 444 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ